БЕЛАРУСКАЯ АКАДЭМІЯ НАВУК
ГЕОЛЁГІЧНЫ ІНСТЫТУТ

Проф. М. Т. БЛІОДУХО

РЕГІСТРАЦЫЙНЫ СЬПІС
КАРЫСНЫХ ВЫКАПНЯЎ БССР

З КАРОТКІМ НАРЫСАМ,
ТАБЛІЦАМІ І КАРТАЮ

ВЫДАНЬНЕ БЕЛАРУСКАЕ АКАДЭМІІ НАВУК
МЕНСК — 1931

10

БЕЛАРУСКАЯ АКАДЭМІЯ НАВУК
ГЕОЛЁГІЧНЫ ІНСТЫТУТ

Проф. М. Т. БЛІОДУХО

55
289
ПРОВЕРЕНО

РЕГІСТРАЦЫЙНЫ СЬПІС КАРЫСНЫХ ВЫКАПНЯЎ БССР

З КАРОТКІМ НАРЫСАМ,
ТАБЛІЦАМІ І КАРТАЮ

инв 5672

Библиотека
Геологического Н.-Д. Института
Института

МЕНСК — 1931

Бібліотека
13492

Менск. Друк. БАН. Галоўлітбел № 244. 9 арк. Зак. № 638. Тыр. 5

ЦНБ им. Я. КОЛАСА
НАН Беларуси

55
289

УСТУП

Вывучэньне мінэральнай сыравіны Белар[illegible] клікае ў пер-
ую чаргу неабходнасьць рэгістрацыі [illegible]ных выкап-
яў, якія пры сучасным стане тэхнікі [illegible]ь ужываццa
посьпехам у прамысловасьці і сельскай гас[illegible]дарцы.

Прымаючы пад увагу тую асаблівасьць, што карыснымі
ыкапнямі ў цэлым шэрагу выпадкаў зьяўляюцца ня толькі
аасобныя мінэралі, але і горныя пароды, з якіх пабудавана
она адкладаў земнай кары, даступная нашаму дасьледвань-
ю, — пытаньне аб належным іх вывучэньні і рэгістрацыі
жа быць разьвязана толькі тады, калі будзе зроблены
адрабязная літалёгічная здымка ўсёй плошчы БССР і будуць
хладзены адпаведныя буйнага маштабу літалёгічныя карты
тай тэрыторыі.

У сучасны момант матар'яламі для вызначэньньня ка-
ысных выкапняў Рэспублікі зьяўляюцца даныя некаторых
таратурных крыніц, а галоўнае—вынікі папярэдняй апра-
оўкі палявых матар'ялаў маршрутных геолёгічных партый,
рацаваўшых на тэрыторыі БССР у апошнія гады.

Складзены мною сьпіс карысных выкапняў БССР зьяў-
нецца трэцім і мае 527 нумароў паасобных згуртаваньняў
абгаленьняў розных парод і мінэраляў.

Першы сьпіс быў складзены мною па Горнаму Аддзелу
СНГБ у 1926 годзе і меў толькі 176 нумароў. Да яго была
блена адпаведная карта карысных выкапняў БССР. Ма-
ялямі да складаньня гэтага сьпісу зьявіліся даныя літа-
урных крыніц і вынікі маршрутных досьледаў геолёгіч-
х партый, з'організаваных Дзяржплянам БССР.

1928 годзе гэты сьпіс і карта былі перароблены мною
падставе новых матар'ялаў, набытых маршрутнымі да-
ледваньнямі тэрыторыі БССР геолёгічнымі партыямі, пра-
аўшымі ад Камісіі па вывучэньню прыродных вытворчых
Беларусі і мелі ўжо 292 нумары.

Організацыя Геолёгічнага Інстытуту пры Беларускай Ака-
Навук і значнае разгортваньне геолёгічнай работы на

тэрыторыі Рэспублікі далі магчымасьць за апошні час амаль што падвоіць колькасьць зарэгістраваных карысных выкапняў.

Трэба адзначыць, што зробленыя да сучаснага моманту маршрутныя досьледы мелі на ўвазе як мага хутчэй ахапіць усю тэрыторыю БССР і высьветліць геолёгічную будову адкладаў паверхневай зоны ў агульных рысах, і дасьледчыкі ня мелі магчымасьці праводзіць дэталёвае вывучэньне генэзісу паасобных згуртаваньняў карысных выкапняў, што застаецца яшчэ проблемаю бліжэйшай будучыні.

Складзены мною сьпіс з прычыны вышэйадзначанага зьяўляецца рэгістрацыйным сьпісам карысных выкапняў Рэспублікі і ўключае даныя, набытыя непасрэдна мною пры геолёгічных дасьледваньнях Беларусі, даныя, набытыя супрацоўнікамі Геолёгічнага Інстытуту БАН, а таксама ўзятыя з некаторых літаратурных крыніц.

Маршрутнае дасьледваньне геолёгічнай будовы тэрыторыі БССР яшчэ ня скончана, і некаторыя раёны, як гэта можна заўважыць па даных сьпісу, гэтымі маршрутамі зусім не закрануты, а другія дасьледваны толькі часткова.

Паколькі маршрутныя геолёгічныя досьледы мелі сваёй мэтаю ў першую чаргу вызначыць тыя раёны, якія багаты на тыя ці іншыя карысныя выкапні і маглі-б стацца ў бліжэйшыя гады асяродкамі буйных горных распрацовак нетраў Рэспублікі, то гэтыя маршрутныя досьледы неаднолькава разьмежаваліся па ўсёй плошчы БССР. Згодна з гэтым, складзены мною сьпіс не дае канчатковага малюнку, які характарызаваў-бы знаходжаньне розных карысных выкапняў на тых ці іншых плошчах, а толькі паказвае знаходжаньне іх на зробленых маршрутах.

Згладжаны рэльеф мясцовасьці, адсутнасьць на значных плошчах прыродных абгаленьняў, за выключэньнем далін паасобных рэчак, нязначнае разьвіцьцё распрацовак нетраў— не давалі неабходных даных для вывучэньня генэзісу згуртаваньняў карысных выкапняў, зарэгістраваных пры маршрутных геолёгічных досьледах, чаму і ацэнка прамысловага значэньня цэлага раду абгаленьняў мае выключна папярэдні характар і патрабуе для належнага заключэньня аб іх прамысловай каштоўнасьці дадатковага правядзеньня горных работ.

Навуковая ацэнка паасобных згуртаваньняў альбо абгаленьняў карысных выкапняў і ўключэньне іх у рэгістрацыйны сьпіс мае пэрсональны характар. У тых выпадках, калі матар'ялы былі сабраны непасрэдна мною пры палявых геолё-

гічных досьледах тэрыторыі БССР, я карыстаўся данымі выключна гэтага вывучэньня.

У тых выпадках, калі мною ня было зроблена агляду згуртаваньня на месцы, у рэгістрацыйным сьпісе зазначана праца таго дасьледчыка, па даных якога гэтае згуртаваньне ўключана ў сьпіс.

Паасобныя манографіі, асабліва больш даўныя, у цэлым шэрагу выпадкаў пры вызначэньні нярудных выкапняў даюць недастаткова выразныя даныя аб месцы іх знаходжаньня, а яшчэ менш прыводзяць даных да характарыстыкі саміх выкапняў. З гэтай прычыны ў сьпіс ня ўносіліся ўсе даныя розных манографій, а толькі некаторыя. У тым выпадку, калі можна было знайсьці падставы для адзначэньня эканомічнай каштоўнасьці згуртаваньня хаця-б для распрацовак мясцовага характару, згуртаваньне ўключалася ў рэгістрацыйны сьпіс.

Магчыма, што некаторыя з адзначаных у сьпісе згуртаваньняў, у выніку недастатковай іх характарыстыкі альбо дзякуючы інтэнсыўнай распрацоўцы іх у ранейшыя гады пры нязначным запасе, будуць мець толькі навуковае, а не прамысловае значэньне.

Прымаючы пад увагу, што вывучэньне органічных адкладаў, асабліва торфу, зьяўляецца задачаю НКЗБ, гэтыя адклады маршрутнымі геолёгічнымі партыямі не вывучаліся, і ў рэгістрацыйны сьпіс уключаны толькі адклады даўных торфа-вугаляў і сапрапэляў, знойдзеных пры вывучэньні іншых карысных выкапняў.

Камэральнае і лябораторнае вывучэньне карысных выкапняў БССР у большасьці яшчэ ня зроблена, і мы ня маем даных, каб вызначыць прамысловую номэнклятуру альбо навуковую групу, у якую трэба залічыць карысныя выкапні з вывучаных абгаленьняў.

Пакуль што пакінута тая назва выкапню, якая была дана яму дасьледчыкам.

Можа здарыцца, што пасьля дэталёвага вывучэньня прыдзецца зьмяніць самую назву некаторых выкапняў. Так, замест гліністай крэйды прыдзецца пароду лічыць маргелем; замест гліны—суглінкам і г. д.

Вывучэньне паасобных згуртаваньняў карысных выкапняў альбо абгаленьняў парод сьведчыць аб тым, што ў адным і тым-жа абгаленьні мы маем розныя адклады і падрабязна ахарактарызаваць іх у сьпісе зьяўляецца немагчымым, дзякуючы чаму агульная назва, як крэйда, маргель і т. д., зьяўляюцца характэрнымі толькі для галоўных адкладаў.

Паколькі ў сьпісе галоўным чынам пералічаны так званыя нярудныя выкапні, якія звычайна займаюць у паверхневай зоне значныя плошчы і ў цэлым шэрагу выпадкаў сустракаюцца паміж некалькімі вёскамі, то вызначэньне згуртаваньня ля аднэй вёскі мае ўмоўны характар. Вызначаецца тое месца, дзе ўмовы знаходжаньня карыснага выкапню зьяўляюцца найбольш спрыяючымі.

У некаторых выпадках адзін адклад вылучаецца на некаторай адлегласьці ў паасобнае згуртаваньне, бо адклады чацьвярцёвага пэрыоду наогул не захоўваюць сваіх асаблівасьцяй і хутка зьмяняюцца, не дапускаючы ўключэньня ўсяго адкладу ў адзіную масу.

Рэгістрацыйны сьпіс карысных выкапняў БССР складзены мною на падставе ўсіх тых даных, якія магчыма было набыць да гэтага часу, але паколькі ён грунтуецца на матар'ялах маршрутных геолёгічных досьледаў, а ў некаторых выпадках на даных літаратурных крыніц, то ён, бязумоўна, мае значныя недахопы і патрабуе далейшай апрацоўкі.

Шчырая просьба да ўсіх таварышоў, якія заняты вывучэньнем і распрацоўкай мінэральная сыравіны Рэспублікі, прыслаць у Геолёгічны Інстытут Беларускай Акадэміі Навук свае заўвагі і дадаткі, якія з удзячнасьцю будуць прыняты і скарыстаны ў бліжэйшы час.

АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА КАРЫСНЫХ ВЫКАПНЯЎ, УКЛЮЧАНЫХ У РЭГІСТРАЦЫЙНЫ СЬПІС

Ня гледзячы на тое, што да апошняга часу папярэдняе геолёгічнае вывучэньне тэрыторыі БССР маршрутнымі геолёгічнымі партыямі яшчэ ня скончана і ў рэгістрацыйны сьпіс уключаны карысныя выкапні толькі па 76 раёнах, а па астатніх 24 даныя ня ўключаны, — усё-ж такі трэба адзначыць, што агульны характар геолёгічных адкладаў, з якіх пабудавана тэрыторыя БССР на даступную нашаму вывучэньню глыбіню, і тыпы тых карысных выкапняў, якія знаходзяцца ў гэтых адкладах, нам ужо вядомы ў дастатковай ступені.

Трэба сказаць, што і ў тых раёнах, якія ня былі дасьледваны партыямі Геолёгічнага Інстытуту БАН і аб якіх няма даных у складзеным мною рэгістрацыйным сьпісе, праводзіліся часткова досьледы партыямі ГГРУ СССР і ВСНГБ і вызначаліся імі знойдзеныя карысныя выкапні. Таксама трэба адзначыць і клясычную працу па геоморфолёгічнаму апісаньню нашага Палесься, зробленую акадэмікам П. А. Туткоўскім у трохвярстовым маштабе. Гэта апісаньне дае хоць некаторы матар'ял аб тых плошчах, якія не дасьледваны яшчэ геолёгічнымі партыямі Інстытуту Беларускае Акадэміі Навук.

Прымаючы пад увагу, што гэтымі досьледамі ня выкрыта іншых тыпаў карысных выкапняў, у агульных рысах ужо можна рабіць агляд мінэральных багацьцяў нетраў Рэспублікі.

Назву карысных выкапняў мы даем тым мінэралям і горным пародам, якія ўжываюцца як мінэральная сыравіна ў прамысловасьці і ў сельскай гаспадарцы.

Да апошніх гадоў карыснымі выкапнямі лічыліся галоўным чынам мінэралі, з якіх здабываліся мэталі, і ўсе пытаньні, зьвязаныя з распрацоўкаю нетраў зямлі, мелі на ўвазе гэтыя так званыя „рудныя выкапні".

Наадварот, мінэралі, якія зьяўляліся галоўнымі часткамі тых мас, з якіх пабудавана земная кара, адносіліся спэцыялістамі да „нярудных выкапняў“; да апошняга часу яны ня лічыліся асабліва карыснымі і нават не рэгістраваліся.

Кастрычнікавая рэволюцыя зрабіла такія глыбокія зрухі ў сучаснай тэхніцы і настолькі актывізавала запатрабаваньні да мінэральнай сыравіны, што пры соцыялістычнай перабудове нашай прамысловасьці і сельскай гаспадаркі гэтыя, здавалася, малакаштоўныя „нярудныя выкапні“ зьявіліся об‘ектамі самага шырокага ўжываньня, і запатрабаваньне на іх склала новую проблему ў горнай справе.

Сучасная тэхніка Саюзу, укараненьне хэміі ў процэсы вывучэньня і скарыстаньня мінэральнай сыравіны ў значнай ступені павялічылі лік так званых „карысных выкапняў“ і далі новыя напрамкі для іх скарыстаньня.

Усякі мінэраль альбо парода будуць скарыстаны належным парадкам толькі тады, калі яны знаходзяцца ў патрэбнай колькасьці ў даным месцы, маюць добрыя эканомічныя ўмовы для свайго скарыстаньня і асабліва па сваёй якасьці адпавядаюць запатрабаваньням тэхнікі, што для „нярудных выкапняў“ мае асабліва важнае значэньне.

Усе паказаныя карысныя выкапні Рэспублікі можна падзяліць на наступныя групы:

А. Нярудныя выкапні.

1)	Долёміты і долёмітызаваныя вапнякі пластовыя	23
2)	Вапнякі пластовыя палеозойскага пэрыоду	3
3)	Крэйда пішучая, гліністая і г. д.	86
4)	Маргелі старадаўныя рознага геолёгічнага ўзросту	16
5)	Маргелі лугавыя і азёрныя чацьвярцёвага пэрыоду	26
6)	Травэрцыны	1
7)	Валуны вапняковыя (паасобныя палі, озы, уключэньні ў галечніках і г. д.)	37
8)	Крэмені розных тыпаў	6
9)	Трэпелы, дыятоміты і інфузорныя землі	2
10)	Апокі	3
11)	Валуны крышталёвых парод	26
12)	Галечнікі	16
13)	Граві	7
14)	Пяскі розныя	52
15)	Гліны (керамічныя, будаўнічыя і г. д.)	76
16)	Флёрыдыны	2
17)	Суглінкі розныя	75

18) Лёсы	4
19) Фасфарыты (плітнякі, конкрэцыі розных тыпаў)	18
20) Іскракі (пірыт, марказіт)	2
21) Торфа-вугалі і сапрапэлі	3
22) Гляўконітавыя пароды (вапнякі, пяскі і гліны) .	—
23) Мінэральныя фарбы і вохры	—
24) Крыніцы мінэралізаваныя	5
	489

Б. Рудныя выкапні.

1) Бурыя жалезьнякі (ліманіты) розных тыпаў .	36
2) Чырвоныя жалезьнякі (гэматыты) . . .	2
3) Фосфарна-кіслыя жалезьнякі (вівіяніты) . .	—
	38.

Гэтая табліца паказвае, што галоўная частка карысных выкапняў, вызначаных па тэрыторыі БССР, да сучаснага моманту належыць да групы „нярудных выкапняў"; з выкапняў, якія маюць у сваем складзе які-небудзь мэталь, мы маем толькі руды жалеза, галоўным чынам у стане ліманітаў, зьвязаных па свайму паходжаньню з прысутнасьцю значных органічных мас у вадаёмах стаячай вады.

З нярудных выкапняў асабліва важнае значэньне мае наяўнасьць у адкладах паверхневай зоны розных вяпнякоў, якія ўжываюцца ў прамысловасьці і сельскай гаспадарцы.

Тут мы маем долёміты і долёмітызаваныя вяпнякі сілюрскага і дэвонскага пэрыодаў, якія сустракаюцца ў карэнным стане і пласткі якіх выходзяць на паверхню ў некаторых мясцох вышэй роўню грунтовых вод, пры нязначанай перакрышы іншымі пародамі, альбо залягаюць на нязначнай глыбіні.

Долёмітызаваныя пластовыя вапнякі сілюрскага пэрыоду сустракаюцца ля вёскі Раванічы (абг. № 406) і вёскі Хутар (абг. № 407), дзе яны маюць ад 30,86% да 37,27% Cao і ад 7,41% да 10,91% Mgo. Усе астатнія абгаленьні пластовых долёмітаў і долёмітызаваных вапнякоў, вызначаных на тэрыторыі БССР, належаць да адкладаў дэвонскага пэрыоду. Як у межах адкладаў галоўнага дэвонскага поля на Полаччыне і Віцебшчыне па рацэ Заходняй Дзьвіне вышэй Віцебску (абг. № 47—49 і 337—339) і па рацэ Сар'янцы ля вёскі Калюты (абг. № 305 і 306), так і далей на поўдзень у паасобных абгаленьнях долёмітаў у вадазборы ракі Дняпра і яго прытокаў ля гораду Воршы (абг. № 229—232) і вёскі

Кабелякі (абг. 233); па рацэ Сажу ля гораду Крычава (абг. № 62), ля гораду Прапойску (абг. № 223—225); на Бабруйшчыне ля станцыі Дараганава (абг. № 3-4; 285 і 421-422) і інш.,—мы маем долёміты, якія зьмяшчаюць да 42,96% $MgCo_3$, што пры наяўнасьці $CaCo_3$ да 54,34% амаль што адпавядае складу нормальнага долёміту. Апошні, вядомы пад назваю горкага шпату, зьмяшчае, згодна хэмічнай формулы $CaCo_3+MgCo_3$, 54,35% карбонату кальцыя і 45,65% карбонату магнія. Зьмяшчаючы ў некаторых паасобных выпадках да 97,08% карбонатаў, гэтыя долёміты зьяўляюцца высокаякаснымі і могуць ужывацца пасьля апаленьня як агнятрывалыя матар'ялы, у якасьці флюсаў (плаўняў) пры мэталюргічных процэсах, пры вырабе цэманту па спосабу Сарэля, з іх таксама могуць здабывацца $MgSo_4$—эпсаміт і MgO magnesia usta.

У значна большай ступені пашыраны долёмітызаваныя вапнякі, якія сустракаюцца сьвітамі паасобных пласткоў, маюць розную якасьць, зьяўляючыся ў некаторых выпадках гліністымі альбо скрамянелымі; пракідаюцца паміж імі і слаба бітумінозныя.

Адначасова сярод агульнай масы долёмітаў і долёмітызаваных вапнякоў дэвонскага пэрыоду мы маем і вапнякі, якія зьяўляюцца амаль чыстымі карбонатамі кальцыю. У ваколіцах гораду Крычава ў канцы Ветранай вуліцы з правага боку ад шляху на г. Чавусы (абг. № 61) былі знойдзены мною адклады сьветла-жоўтых з бурымі і чырвонымі плямамі вапнякоў палеозойскага перыоду, якія па даных хэмічнага аналізу зьмяшчаюць да 52,49% CaO і толькі да 0,63% MgO. Гэтыя вапнякі, маючы да 92,50% $CaCo_3$, зьяўляюцца добрымі матар'яламі для здабываньня вапны.

Пластовыя долёміты і вапнякі палеозойскага ўзросту, як можна заўважыць з складзенага сьпісу, не згуртаваны ў адным месцы, а наадварот, выходзяць на паверхню ў значных абгаленьнях і ў розных месцах, што мае эканомічнае значэньне для мясцовага іх скарыстаньня.

Акрамя пластовых выхадаў, гэтыя долёміты і вапнякі сустракаюцца ў стане валуноў і галькі ў чацьвярцёвых адкладах, якія перакрываюць моцным пакровам ранейшыя карэнныя адклады і даюць згуртаваньні, якія маюць прамысловы характар. У складзеным сьпісе вызначана да 30 месц, дзе концэнтрацыя іх заўважана значна павялічанай.

Асабліва важнае значэньне для прамысловасьці і сельскай гаспадаркі БССР маюць адклады крэйды розных тыпаў, якія сустракаюцца ў паверхневых зонах на поўдзень ад галоў-

нага дэвонскага поля. Вызначана, што адклады крэйдавага пэрыоду больш усяго пашыраны ў вадазборы ракі Сажа, дзе яны займаюць значныя плошчы і складаюць унутраныя часткі ўзвышшаў, пракідаюцца ў выглядзе моцных абгаленьняў, даючы тоўшчы да 30 мэтраў вышэй роўню грунтовых вод. У гэтых абгаленьнях адклады крэйды маюць пластовы характар, прычым звычайна розныя пласткі па сваёй якасьці адрозьніваюцца ў значнай ступені, што трэба мець на ўвазе як пры проектаваньні, падлічваючы запасы адкладаў, так і пры распрацоўках. Тут мы маем адклады пухкай пішучай крэйды туронскага пэрыоду, якая мае ў некаторых абгаленьнях ад 94,57% да 96,80% $CaCo_3$ пры нерашчыняемай астачы ад 0,38 да 2,12%. Часта яе падсьцілае пяшчаністая крэйда сэнаманскага ўзросту, якая мае толькі да 65,27% $CaCo_3$ пры нерашчыняемай астачы да 24,67%; глыбей, узбагачаючыся кварцавымі зярнятамі, яна пераходзіць паступова ў карбонатныя кварцавыя пяскі. Сустракаюцца адклады і гліністай крэйды і крэйдавых рухлякоў, якія зьмяшчаюць у рознай колькасьці дамешку тленьнікаў жалеза і гліназёму, розных сілікатаў і алюмасілікатаў у агульнай суме ад 5,0% да 20% масы: так, гліністая крэйда з аднаго пласта ў ваколіцах горада Клімавіч мае да 79,0% $CaCo_3$ пры 14,39% нерашчыняемае астачы.

Адклады крэйды ў вадазборы Сажа знаходзяцца ў першапачатковым заляганьні і перакрываюцца адкладамі трацьцёвага пэрыоду больш на поўдзень, у ніжнім цячэньні ракі, а адкладамі чацьвярцёвага часу па ўсёй астатняй плошчы, але пераважна на поўначы, у верхнім цячэньні ракі Там, дзе гэтая перакрышка зьяўляецца нязначнай па таўшчыні, эканомічна выгадна весьці распрацоўку адкладаў крэйды. Найбольш важнымі абгаленьнямі крэйды ў вадазборы ракі, Сажа трэба лічыць абгаленьні ля вёскі Рэзанцы (абг. № 66) і Куравічы (абг. № 65) па рэчцы Вехры; абгаленьні па рацэ Астры ля вёсак Нанаскавай (абг. № 71) і Іванаўшчыны (абг. № 104), ля г. Клімавіч у вадазборы ракі Лабжанкі на крэйдавай гары і ў другіх месцах; нарэшце цэлы рад значных абгаленьняў па самай рацэ Сажу, як напрыклад, абгаленьні крэйды ля вёсак Парадзіна (абг. № 69), Задабрасьць, Паклады, м. Гайшын і г. д.

Адклады пішучай крэйды, гліністай крэйды і крэйдавых рухлякоў знойдзены ў вадазборы рэк Дняпра і Нёмна на Меншчыне і Бабруйшчыне, але да апошняга часу застаюцца яшчэ слаба вывучанымі. Мы ня ведаем у цэлым шэрагу абгаленьняў, ці крэйда ў іх знаходзіцца ў карэнным стане, ці

яна зьяўляецца толькі ўключэньнем значнымі паасобнымі кавалкамі ў ледавіковых адкладах; ня вызначаны таксама і геолёгічны ўзрост розных адкладаў крэйдавага пэрыоду. Паколькі дасьледваньне гэтай крэйды праводзіцца мною ў сучасны момант, трэба спадзявацца, што неабходныя даныя будуць здабыты ў бліжэйшы тэрмін.

Высокая тэхнічная якасьць некаторых адкладаў крэйды, значная іх колькасьць, спрыяючыя ўмовы знаходжаньня — усе гэтыя абставіны робяць адклады крэйды найбольш важнымі ў нашай мінэральнай сыравіне. У складзеным мною сьпісе вызначана 81 абгаленьне крэйды—прыблізна ў 3 разы больш, чым абгаленьняў вапнякоў палеозойскага ўзросту, а па эканомічнай масе адклады крэйды настолькі пераважаюць апошнія, што ня можа быць ніякага параўнаньня.

У раёнах значнага пашырэньня крэйдавых адкладаў трэба адзначыць наяўнасьць другарадных адкладаў вапнякоў з крыніц, якія маюць у растворы $Ca(HCO_3)_2$—так званых вапняковых туфаў і травэрцынаў. У часе палявых геолёгічных досьледаў мною было знойдзена ў вадазборы рэчкі Асьленкі, паміж вёскамі Асьленкай і Белішчынай (абг. № 516) у адкладах чацьвярцёвага пэрыоду досыць моцнае абгаленьне травэрцынаў, якія перакрываюць тут адклады ніжэйзьмешчанай тоўшы крэйды. Па даных хэмічных аналізаў гэтыя травэрцыны зьяўляюцца высокаякаснымі вапнякамі, якія маюць ад 95,91% да 97,07% $CaCo_3$ і толькі ад 0,13% да 0,26% нерашчыняемай астачы. Зьяўляючыся па сваёй прыродзе хэмічнымі ападкамі, яны ня маюць у сваім складзе зернят пяску і гляўконіту.

Сярод розных адкладаў, пашыраных на тэрыторыі БССР, асабліва важнымі зьяўляюцца розныя маргелі і моцна карбонатныя пароды. Паміж адкладаў гэтай групы можна вызначыць па характару паходжаньня і па ўмовах, у якіх яны знаходзяцца, дзьве паасобныя падгрупы.

Да першай падгрупы належаць усе маргелі і маргелістыя пароды морскага тыпу, якія ўваходзяць у сэрыі карэнных адкладаў дэвонскага, крэйдавага і трацьцёвага пэрыодаў і зьвязаны з імі зональна. Гэтыя маргелі даюць значныя па масе адклады пластовага тыпу і захоўваюць добра свае ўласьцівасьці. Паміж імі да апошняга часу ня вызначана маргеляў, якія маюць тэорытычны склад цэмантавых маргеляў, але пры а начасовым знаходжаньні ў сэрыі адкладаў як вапнякоў, так і глін, атрыманьне масы належнага складу для вырабу партлянд-цэманту ня можа лічыцца асабліва цяжк м.

Да другой падгрупы належаць маргелі, якія стварыліся галоўным чынам у працягу чацьвярцёвага пэрыоду і належаць па свайму паходжаньню да акладаў контынэнтальнага тыпу. У большасьці гэта так званыя прэснаводныя рэчныя, азёрныя і лугавыя маргелі. Воды, багатыя бікарбонатамі кальцыю, у прысутнасьці значных мас гніючых расьлін даюць ападкі карбонату кальцыя, які, гуртуючыся на дне вадаёмаў стаячай вады ў залівах азёр і затоках рэчак, дае адклады маргеляў у сярэднім да 0,5 мэтра таўшчыні. Сустракаючыся ў стане паасобных лінзаў, гэтыя адклады маргеляў, ня гледзячы на значнае пашырэньне ў некаторых раёнах, даюць абмежаваны запас эксплёатацыйнай масы і маюць толькі мясцовае значэньне. Розныя маргелі значна адрозьніваюцца паміж сабою ня толькі па хэмічнаму складу, галоўным чынам, па ўтрыманьню карбонату кальцыя, але і па розных іншых уласьцівасьцях. Маргелі пападаюцца рознага колеру, рознага складу і структуры. Паміж рознымі групамі маргеляў асабліва важнае значэньне маюць так званыя керамічныя маргелі. Сюда належаць маргелі старадаўныя і больш маладыя. Керамічныя маргелі скарыстоўваліся ў БССР і раней на заводах па вырабу кахлі. Заводы на маргелях чацьвярцёвага пэрыоду былі пабудаваны ў раёне гораду Копыся, а на маргелях крэйдавага пэрыоду ў горадзе Прапойску.

Масыўна крышталёвыя і слаіста крышталёвыя пароды пратэразойскага ўзросту, якія знаходзяцца ў карэнным стане на паверхні зямлі па-за межамі Рэспублікі, на поўнач— у Фінляндыі і на поўдзень—на Украіне,—на тэрыторыі БССР значна паглыбіліся і не дастаюцца зробленымі сьвідраванымі прабоінамі. Магчыма, што яны залягаюць няглыбока ў вадазборы ракі Ўборці, правага прытоку ракі Прыпяці, ля самай паўднёвай мяжы Рэспублікі, дзе яны могуць быць знойдзены на нязначнай плошчы. У той-жа час мы маем колёсальную колькасьць гэтых парод, раскіданых амаль па ўсёй плошчы БССР у стане валуноў крышталёвых парод—так званых эротычных валуноў, розных галечнікаў крышталёвых парод і гравійных матар'ялаў, зьвязаных з дзейнасьцю ледавіка. Гэтыя масы вельмі каштоўных матар'ялаў альбо разьмежаваны на паасобных плошчах (палі валуноў, пласты галечніку ў пяскох і г. д.), альбо згуртаваны ў значнай колькасьці на нязначнай плошчы; сюды належаць канцовыя морэны, озы, некаторыя галечнікі і г. д. У некаторай частцы яны зьяўляюцца ў значнай ступені выветранымі і ня маюць належнай прамысловай каштоўнасьці. Наадварот, сярод

некаторых парод, асабліва кварцытаў, пескавікоў і дробна-зярнёвых гранітаў, мы знаходзім паасобныя кавалкі зусім ня зьмененымі. У некаторых мясцох згуртаваньні валуноў і галькі крышталёвых парод зьмяшчаюць у рознай колькасьці валуны і гальку вапняковых парод сілюрскага і дэвонскага пэрыодаў. Вызначэньне мэтазгоднасьці распрацоўкі гэтых матар'ялаў і падлік запасаў у згуртаваньнях і на паасобных плошчах могуць весьціся толькі на падставе некаторых сярэдніх лічбаў, атрыманых пры вывучэньні адкладаў з увядзеньнем коэфіцыенту запасу. Менш значныя згуртаваньні вычэрпваюцца ў некаторых выпадках на працягу некалькіх гадоў, і іх азначэньне ў сьпісе мае гістарычны характар.

Значна пашыранымі сярод адкладаў паверхневай зоны зьяўляюцца розныя пяскі. У адкладах морскага тыпу дачацьвярцёвага ўзросту ўключаны пласткі роўнамерна-зярнёвых кварцавых пяскоў, у некаторых выпадках лушчаковых (сьлюдзяных) з зернямі гляўконітаў, а ў некаторых выпадках конкрэцыі фасфарытаў. Тут сустракаюцца дробна-зярнёвыя пяскі, як напрыклад, у паселішчы Выдрынка ў 3-х кілёмэтрах ад гораду Клімавіч (абг. № 145), ля вёскі Парадзіна ў адкладах вышэй крэйды, у вадазборы рэчкі Асьленкі і іншых месцах, якія, згодна даных хэмічных аналізаў, зьмяшчаюць больш 97% SiO_2. У адкладах чацьвярцёвага часу сустракаюцца значныя масы пяскоў рознага паходжаньня. Па далінах сучасных рэчных сыстэм і па западзінах азёр згуртаваны алювіяльныя пяскі; сярод адкладаў ледавікоў знаходзяцца флювіягляцыяльныя пяскі, а перад канцовымі морэнамі—зандравыя палі. Зьверху морэны перакрыты надморэнавымі несартаванымі пяскамі, якія зьмяшчаюць валуны і гальку крышталёвых парод і вапнякоў альбо пяскамі эолевага паходжаньня. Апошнія ўтвараюць выдмы (дзюны) і барханы на значных прасторах у межах зандраў і па далінах рэк, багатых плошчамі алювіяльных незадзярнелых пяскоў. Пяскі чацьвярцёвага пэрыоду, за выключэньнем пяскоў зоны падзолу, зьяўляюцца ў большасьці афарбаванымі тленьнікамі жалеза ў розныя адценьні жоўтага, бурага і чырвонага колеру. Яны зьмяшчаюць дамешку зярнят палявых шпатаў, рагавых абманак, лісточкаў лушчаку і ў цэлым шэрагу выпадкаў зьяўляюцца няроўнамерна-зярнёвымі і слаба адсартаванымі. У сьпісе вызначана 53 месцазнаходжаньні розных пяскоў, добра яшчэ ня вывучаных.

З сілікатавых матар'ялаў, знойдзеных у адкладах на тэрыторыі БССР, трэба адзначыць крэмені, трэпелы і апокі.

Крэмені ў карэнным стане вызначаны ў адкладах дэвонскага пэрыоду, дзе яны складаюць пласты нязначнай таўшчыні з паасобных конкрэцый паміж пластамі долёмітаў і долёмітызаваных вапнякоў. У вадазборы ракі Заходняй Дзьвіны, сярод долёмітаў у абгаленьнях ракі вышэй Віцебску і ў вадазборы ракі Дняпра ля Воршы знойдзены такія сьцяжэньні цёмна-шэрага ў белай абалонцы крэменю. Затым нам вядомы конкрэцыі чорнага, бліскучага, з матаваю паверхняю крэменю; у некаторых выпадках сьветлага альбо бура-жоўтага колеру з акладаў крэйды. У апошняй конкрэцыі крэменю таксама складаюць пласткі нязначнае таўшчыні. Вызначана концэнтрацыя сьцяжэньняў і конкрэцый крэмэню сярод галечнікаў у чацьвярцёвых адкладах асабліва ў гальцы па берагох ракі Дняпра ў Воршы і ракі Сажа на значным працягу яго цячэньнія. Практычна ў сучасны момант скарыстоўваюцца толькі крэмені з другапарадкавых заляганьняў у чацьвярцёвых адкладах.

Пры дасьледваньні раёну Копыся ў 1924 годзе, ня гледзячы на тое, што там раней праводзіліся значныя распрацоўкі мясцовай мінэральнай сыравіны на заводах па вырабу кахлі, мною была вызначана ў першы раз наяўнасьць паасобных адкладаў таўшчынёю больш 1,5 мэтраў, якія пры вывучэньні аказаліся складзенымі з астач панцыраў дыятомей некалькіх відаў; яны былі вызначаны спачатку на ўзвышшах левага берагу ракі Дняпра, а потым знойдзены ў тых-жа ўмовах і на правым беразе ракі. Гэтыя пароды зьявіліся тыповымі дыятамітамі і па даных хэмічных аналізаў зьмяшчаюць ад 78,6% да 82,6% нерашчыняемай у кіслотах астачы. Па свайму складу яны зьяўляюцца вельмі каштоўным матар'ялам, на які маецца вялікае запатрабаваньне з боку прамысловасьці. Вывучэньне ўмоў знаходжаньня гэтых трэпелаў у раёне гораду Копыся дае ўпэўненасьць, што аналёгічныя адклады будуць выкрыты ў вадазборы ракі Дняпра і ў другіх мясцох, сярод адкладаў чацьвярцёрага пэрыоду.

Геолёгічнае вывучэньне адкладаў у вадазборы ракі Астра, левага прытоку ракі Сажа, у той яго частцы, якая ўваходзіць у межы БССР, дало мажлівасьць мне ў першы раз у 1926 годзе выявіць прысутнасьць адкладаў так званых апок, вывучэньне якіх было мною праведзена больш дэталёва ў 1928 годзе. Вывучаючы адклады крэйды ў абгаленьнях правага берегу ракі Астра каля вёскі Роськавай і вёскі Стары Дзедзін, а затым і па левым беразе на Крэйдавай гары ля вёскі Іванаўшчына, мною было вызначана, што

белая крэйда ў паверхневай частцы пласту ўзбагачаецца SiO_2 і пераходзіць у так званую апоку. Таўшчыня апок павялічваецца на ўсход, дасягаючы ў в. Іванаўшчыны, у берагавых абгаленьнях больш 0,5 мэтра таўшчыны (абг. № 104). Хэмічнымі аналізамі выявілася, што гэтыя апокі зьмяшчаюць нерашчыняемай астачы ў абгаленьнях каля вёскі Роськавай ад 52,26% да 58,63% і ля вёскі Іванаўшчыны да 82,6%. Апокі вывучаны мною пакуль што толькі ў абгаленьнях берагоў ракі Астра і не прасочаны далей ад берагоў, што можа даць яшчэ больш карысныя вынікі.

Тэрыторыя БССР зьяўляецца багатаю на адклады розных глін, суглінкаў і супесяй. Паколькі паверхневую зону складаюць у большасьці моцныя ледавіковыя адклады, то найбольш пашыранымі зьяўляюцца так званыя морэнавыя суглінкі. Гэта пароды больш-менш чыста гліністыя, плястычныя, розных адценьняў чырвона-бурага альбо шэрага колеру, у некаторых выпадках сіняватага колеру, у большасьці з дамешкаю рознага процанту пяскоў і амаль што заўсёды карбонатныя. Асноўная характарыстыка іх—уключэньне несартаваных матар'ялаў ад пылу, дробных зярнятак да валуноў буйнага памеру. Морэнавыя суглінкі ўжываюцца насельніцтвам і тэхнікай у залежнасьці ад іх складу. Трэба адзначыць, што наогул гэтыя пароды хутка зьмяняюцца і на нязначнай адлегласьці маюць ужо другі склад, у выніку чаго нельга атрымаць значную масу аднолькавага складу. Сярод пэлітаў зьвязаных з адкладамі ледавікоў, асабліва трэба адзначыць знаходжаньне вельмі каштоўных, так званых істужкавых глін, якія павінны быць вылучаны ў асобную групу. У сучасны момант істужкавыя гліны скарыстоўваюцца з посьпехам у шэрагу месц на паўночы БССР. Зьяўляючыся ападкамі ледавіковых вод, істужкавыя гліны даюць сэрыю гадавых пластоў, складзеных вельмі тонка адмучанымі матар'яламі, што адрозьнівае іх ад груба сартаваных матар'ялаў морэнавага суглінку. Гліны, зьвязаныя з карэннымі адкладамі парод дэвонскага, крэйдавага і трацьцёвага пэрыоду, зьяўляюцца рознымі па свайму складу і па сваіх уласьцівасьцях, і паміж імі можна, бязумоўна, адшукаць вельмі каштоўныя для прамысловасьці, але яны залягаюця пад перакрышкаю чацьвярцёвых парод значнай таўшчыні і ў большасьці вызначаюцца толькі пры правядзеньні сьвідраваных прабоін на значнай глыбіні. У тых нямногіх выпадках, калі яны выходзяць у абгаленьнях на земную паверхню альбо набліжаюцца да яе, пажадана самае шырокае вывучэньне іх. Зьяўляючыся адкладамі мора, пласты гэтых глін захоўваюць добра свае ўласьцівасьці

і хэмічны склад, і з іх можна здабыць масу пэўнай якасьці. Да апошняга часу гліны гэтыя скрыстоўваюцца мала.

Перад намі стаіць адно з найбольш важных пытаньняў для Беларусі ў зьвязку з пабудовай на яе тэрыторыі моцных электра-цэнтраляй,—гэта адшуканьне сярод гліністых матар'ялаў руд мэталю алюмінія.

У часе дасьледваньня ўсходняй часткі Аршаншыны ў 1924 г. і 1925 гадох мною была вызначана ў першы раз наяўнасьць паасобных глін сьветла-зялёнага колеру, якія перакрываюць адклады крэйды ля вёскі Парадзінай і якія па іх уласьцівасьцях трэба аднесьці да асобнай групы так званых флёрыдынавых глін. Яны пры зьмешваньні з вадою не даюць плястычнай масы, маюць значныя абсорбуючыя ўласьцівасьці і могуць ужывацца для абсорбаваньня розных компанэнтаў з расьлінных аліваў і нафтаў. Яны таксама могуць зьявіцца напаўняльнікамі пры вырабе мыла, могуць быць скарыстаны і ў шэрагу іншых процэсаў. Гліны з раёну Парадзіна па хэмічнаму складу належаць да лепшых груп клясыфікацыі Бэнсмана. Трэба адзначыць, што да апошняга часу яшчэ не праведзена належнага вывучэньня гэтых адкладаў флёрыдынаў і ня вызначана іх прамысловая каштоўнасьць у завадзкім маштабе.

З пэлітаў трэба адзначыць яшчэ моцныя адклады лёсаў і іх гамолагаў, якія перакрываюць на паверхні і па схілах узвышшаў значныя плошчы і даюць у абгаленьнях адвесныя сьценкі ў некалькі мэтраў. Гэтыя порыстыя, непластовыя сьветла-жоўтага колеру пароды зьяўляюцца вядомымі каштоўнымі глебамі; у прамысловасьці да апошняга часу ўжываюцца зусім слаба. Сюды належыць яшчэ значная група так званых лёсаватых парод, якія зьмяшчаюць ня толькі пылаватыя, але часткай і больш грубыя матар'ялы; у абгаленьнях гэтыя пароды не даюць адвесных сьценак.

Асабліва важнае значэньне для БССР мае знаходжаньне па яе тэрыторыі ў адкладах рознага геолёгічнага ўзросту згуртаваньняў фасфарытаў, якія сустракаюцца ў стане пліты, альбо паасобных канкрэцый рознай велічыні. З адкладаў, вядомых на тэрыторыі БССР, толькі адклады дэвонскага пэрыоду не зьмяшчаюць фасфарытаў, ва ўсіх-жа астатніх, напрыклад, юрскіх, крэйдавых, трацьцёвых і часткай чацьвярцёвых мы знаходзім згуртаваньні фасфарытаў рознага тыпу. Фасфарытавая пліта зьяўляецца пескавіком, цэмантаваным фосфарна-кіслым кальцыем і знаходзіцца ў адкладах сэнаманскага ярусу крэйдавай сыстэмы, якія выходзяць на дзённую паверхню на ўсход ад Мсьціслаўля ля вёсак Гразь,

5672

Бахараўка ды іншых па-за межамі БССР. Па даных хэмічных аналізаў яна зьмяшчае ад 16,26% да 18,48% P_2O_5. Вывучэньне фасфарытавых конкрэцый, зробленае мною па матар'ялах, здабытых у часе палявых досьледаў, сьведчыць аб тым, што мы тут маем конкрэцыі рознага паходжаньня і рознага якаснага складу.

Для сыстэматыкі і належнай клясыфікацыі фасфарытавых конкрэцый мною непасрэдна вызначана некалькі паасобных тыпаў.

Першы тып — гэта фасфарытавыя конкрэцыі цёмнага ды чорнага колеру, гліністыя, без паасобных зярнят пяску, матавыя, у перарэзе з гладкаю, часта бліскучаю паверхняю, даволі добра акатаныя; у шэрагу выпадкаў прасьверленыя фалладамі. Гэтыя конкрэцыі па даных хэмічных аналізаў зьмяшчаюць ад 28,91% да 30,12% P_2O_5. Знойдзены пакуль што як дамешка ў галечніках чацьвярцёвага пэрыоду на Мсьціслаўшчыне.

Другі тып фасфарытавых конкрэцый таксама гліністы, без уключэньня кварцавых зярнят, у перарэзе белы альбо сьветла-шэры, „гроздьевидный" па форме, з паверхні матава-шэры, у некаторых выпадках пакрыты сьветла-бураю паліваю. Па даных хэмічных аналізаў зьмяшчае да 19,61% P_2O_5. Вызначаны мною ў невялікіх згуртаваньнях у адкладах чацьвярцёвага пэрыоду ў вадазборы рэчкі Лабжанкі.

Трэці тып конкрэцый фасфарытаў пяшчаністы, сьветла-шэры, з уключэньнем зярнят гляўконіту; у перарэзе дае пясок і зярняты гляўконіту, цэмантаваныя сьветлым цэмантам фосфарна-кіслага кальцыя; „гроздьевидный" па форме, акатаны ў рознай ступені, з матава-шэраю паверхняй, часткай пакрыты невялікімі плямамі палівы цёмнага колеру. У карэнным стане зьвязаны з адкладамі фасфарытавых конкрэцый у зеленавата-шэрых пяскох сэнаманскага ўзросту, а ў другапарадкавых адкладах знойдзен, як дамешка сярод галечнікаў чацьвярцёвага пэрыоду. Гэты фасфарыт зьяўляецца найбольш бедным і па даных хэмічных аналізаў зьмяшчае ад 11,45% да 16,85% P_2O_5.

Затым вызначан яшчэ цэлы шэраг паасобных тыпаў фасфарытаў у адкладах крэйдавага і трацьцёвага пэрыоду, якія маюць толькі навуковае значэньне.

З усіх паземаў, якія зьмяшчаюць адклады фасфарытаў у стане пліты і паасобных конкрэцый, у сучасны момант мае прамысловае значэньне толькі адзін пазем, які зьвязан з адкладамі сэнаманскага ярусу крэйдавае сыстэмы, хаця ён уключае найбольш бедныя пяшчаністыя фасфарыты. Су-

часнае разгортваньне нашае фасфатавае прамысловасьці ідзе за кошт скарыстаньня гэтых фасфарытаў. Некаторае прамысловае значэньне, больш мясцовага характару, маюць другарадныя згуртаваньні фасфарытавых конкрэцый у адкладах чацьвярцёвага пэрыоду, як напрыклад, у вадазборы рэчкі Лабжанкі.

Нашы больш багатыя гліністыя фасфарытавыя конкрэцыі, якія зьмяшчаюць да 30,12% P_2O_5, па сваёй якасьці ня ўступаюць рыначным сартам Алжырскіх і Туніскіх фасфарытаў, якія зьмяшчаюць ад 26,5% да 31,1% P_2O_5; пажадана, каб далейшыя дасьледваньні выкрылі знаходжаньне гэтых фасфарытаў у карэнным стане і тым далі яшчэ больш магчымасьці разгарнуць гэтую важную для сельскай гаспадаркі галіну прамысловасьці.

Ва ўмовах БССР асабліва важным пытаньнем зьяўляецца магчымасьць здабываньня на месцы пірыту альбо марказыту — мінэраляў, патрэбных у тэхніцы для вырабу сярчанай кіслаты. Вывучэньне адкладаў крэйдавага пэрыоду, праведзенае мною ў габінэце Геолёгічнага Інстытуту, далі магчымасьць вычначыць спачатку, што зялёна-шэрыя пяскі сэнаманскага ярусу ў сваёй масе зьмяшчаюць нязначную колькасьць пірыту ў раскіданым стане. Далейшае вывучэньне паказала, што гэтыя пяскі ў некаторай зоне і ў некаторых мясцох зьяўляюцца больш узбагачанымі пірытам, і зросткі пірыту, якія наогул назіраюцца толькі пры павялічэньні, тут значна павялічваюцца. Выходзячы з гэтага, вядзецца далейшае вывучэньне, якое паступова дае лепшыя вынікі. Так, у адкладах пяскоў альбо пяшчаністай крэйды на Крэйдавай гары ў вадазборы рэчкі Лабжанкі ля гораду Клімавіч, мною быў вызначаны на глыбіні 25,0-26,0 мэтраў прапластак, які згодна даных хэмічнага аналізу паказаў у сваім складзе FeS_2 у 6,62%. З зялёна-шэрых-жа пяскоў крэйдавага пэрыоду сьвідраванаю прабоінай, зробленай Белсельбудам у Старым Быхаве, былі здабыты з глыбіні 60,0 мэтраў зросткі пірыту памерам да 5 сантымэтраў у большай колькасьці. У сучасны момант гэтае пытаньне зьяўляецца тэорытычным і патрабуе далейшага працягу.

Адклады торфа-вугаляў і сапрапэляў у чацьвярцёвых адкладах былі заўважаны геолёгічнымі партыямі, але сцэцыяльна не вывучаліся, дзякуючы чаму вызначана ў сьпісе толькі некалькі месц, у той час як чацьвярцёвыя адклады наогул зьяўляюцца багатымі на гэтыя матар'ялы.

Гляўконітавыя пароды, як вапнякі, гліны і асабліва розныя пяскі, сустракаюцца ў значнай колькасьці паміж карэн-

нымі адкладамі, але пакуль што яны ня вывучаны, для іх не распрацавана належная клясыфікацыя, чаму яны ў складзеным мною сьпісе ня вызначаны ў асобную групу.

З мінэралізаваных крыніц на тэрыторыі БССР да апошняга году былі вядомы — у Баркаўшчызьне і Мяжыцы сярчана-жалезістыя і ў Лагойску — жалезістыя. Сьвідраваньне глыбокіх прабоін у Менску і Бабруйску ў мінулым годзе выявіла, што тут на глыбіні 280-300 мэтраў маецца пазем у пескавіковым ярусе дэвонскага пэрыоду. Ён дае салёную ваду, вельмі каштоўную ў лекавых адносінах.

З гэтага пераліку можна заўважыць, што тэрыторыя БССР багата на розныя нярудныя выкапні. Яны сустракаюцца ў значнай колькасьці і забясьпечваюць разгортваньне многіх відаў прамысловасьці, якія маюць патрэбу ў высокаякаснай мінэральнай сыравіне і даюць сельскай гаспадарцы патрэбныя для яе інтэнсыфікацыі мінэральныя ўгнаеньні, з багатым зьместам вапны, фосфару і калію.

Што да рудных выкапняў, дык праўда, што тут няма асабліва каштоўных выкапняў, якія-б мелі ў сваім складзе мэталі — золата, серабро, медзь, сьвінец ды іншыя, але сярод забалочаных абшараў, па розных сенажацях, у нізінах і поймах рачных сыстэм знаходзяцца раскіданыя на значнай плошчы рудныя згуртаваньні галоўнейшага з мэталяў — жалеза. Тут знаходзяцца розныя віды ліманіту: буры жалязьняк, розныя балотныя і дзярновыя руды, чырвоны жалязьняк, гэматыт, фосфарна-кіслыя злучэньні жалеза, вівіяніт; апошнія два ў параўнаньні з ліманітам у нязначнай колькасьці.

Гэтыя жалезьнякі яшчэ толькі пачаты вывучэньнем і для іх дасьледваньня распрацоўваецца належная мэтодолёгія.

Вывучаючы рудныя выкапні Рэспублікі, я ўпэўнены, мы ўкладаем свае першыя цагліны ў пабудову на працягу другой пяцігодкі гіганта чорнай мэталюргіі, замест тых шматлікіх „рудняў“, якімі калісьці была так багата Беларусь.

ТАБЛІЦА

АГУЛЬНАГА ПАДЛІКУ І РАЗЬМЕРКАВАНЬНЯ ПААСОБНЫХ КАРЫСНЫХ ВЫКАПНЯЎ Б. С. С. Р. ПА РАЁНАХ

ЦНБ им. Я. КОЛАСА
НАН Беларуси

№ па альфабэту	№ па карце	РАЁН	Долёміты і долёміты-заван. вапнякі пластов. 1	Вапнякі пластов. палеозойскага ўзросту 2	Крэйда пішучая, гліністая і г. д. 3	Маргелі старадаўныя розн. геолёгічн. ўзр. 4	Маргелі лугав. і азёрн. чапьвярцёв. пэрыоду 5	Травэрцыны 6	Лёсы 7	Суглінкі розныя 8	Пяскі 10	Граві 11	Галечнікі 12	Валуны крышталёвых парод 13	Валуны вапняковыя 14	Флёрыдыны 15	Фасфарыты 16	Іскракі 17	Крэмені 18	Трэпелы 19	Апокі 20	Жалезьнякі бурыя 21	Гематыты 22	Торфа-вугалі і сапрапэлі 23	Крыніцы мінэралізаваныя 24	Усяго
1	84	Азарыцкі	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
2	27	Аршанскі	5	—	—	3	—	—	—	1	—	—	—	—	4	—	—	—	1	—	—	—	—	—	—	15
3	53	Асіпавіцкі	3	—	—	—	—	—	—	3	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	7
4	2	Асьвейскі	—	—	—	—	1	—	—	—	—	—	—	1	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	2
5	66	Бабруйскі	—	—	7	—	—	—	—	4	4	—	—	—	—	—	2	—	—	—	—	—	—	—	1	21
6	21	Багушэўскі	—	—	—	—	—	—	—	—	2	—	2	2	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	6
7	31	Барысаўскі	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	1	—	—	—	—	—	—	1	—	—	—	2
8	14	Бешанковіцкі	—	—	—	—	—	—	—	3	—	3	—	1	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	7
9	4	Боркавіцкі	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
10	98	Брагінскі	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
11	79	Буда-Кашалеўскі	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	2
12	57	Быхаўскі	—	—	1	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	1	—	—	—	—	—	—	—	2
13	17	Бягомльскі	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	5	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	5
14	45	Бялыніцкі	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
15	44	Бярэзінскі	—	—	—	—	2	—	—	1	—	—	—	—	1	—	—	—	—	—	—	1	—	—	—	5
16	88	Веткаўскі	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
17	8	Ветрынскі	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	3	1	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	8
18	12	Віцебскі	6	1	—	—	—	—	—	3	2	1	4	3	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	23
19	10	Вульскі	—	—	—	—	—	—	—	2	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	1	—	—	—	4
20	9	Вушацкі	—	—	—	—	1	—	—	1	—	—	—	—	2	—	—	—	—	—	—	—	—	—	1	5
21	15	Высачанскі	—	—	—	—	—	—	—	1	3	—	2	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	7
22	6	Гарадокскі	—	—	—	—	—	—	—	—	1	2	1	2	1	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	7
23	76	Глускі	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	1	—	—	—	—	—	—	2	—	—	—	3
24	89	Гомельскі	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
25	36	Горацкі	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
26	63	Грэскі	—	—	1	—	—	—	—	1	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	2

№ па альфабэту	№ па карце	РАЁН	Долёміты і долёміты-заван. вапнякі пластов. 1	Вапнякі пластов. палеозойскага ўзросту 2	Крэйда пішучая, гліністая і г. д. 3	Маргелі старадаўныя розн. геолёгічн. ўзр. 4	Маргелі лугав. і азёрн. чацьвярцёв. пэрыоду 5	Травэртыны 6	Лёсы 7	Суглінкі розныя 8	Гліны 9	Пяскі 10	Граві 11	Галечнікі 12	Валуны крышталёвых парод 13	Валуны вапняковыя 14	Флёрыдыны 15	Фасфарыты 16	Іскракі 17	Крамяні 18	Трэпелы 19	Апокі 20	Жалезьнякі бурыя 21	Гематыты 22	Торфа-вугалі і сапрапэлі 23	Крыніцы мінэралізаваньня 24	Усяго
27	37	Дрыбінскі	—	—	1	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	1
28	1	Дрысенскі	2	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	1	—	4
29	28	Дубровенскі	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	3	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	7
30	78	Жлобінскі	—	—	—	—	1	—	—	4	1	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	5	—	—	—	14
31	68	Журавіцкі	—	—	1	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	1
32	81	Жіткавіцкі	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	1	—	—	—	1
33	38	Заслаўскі	—	—	—	—	—	—	—	1	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	1
34	99	Камарынскі	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
35	83	Капаткевіцкі	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
36	62	Капыльскі	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	1	—	—	—	1
37	93	Каралінскі	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
38	69	Кармянскі	—	—	6	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	2	—	—	2	—	—	—	12
39	71	Касьцюковіцкі	—	—	—	6	—	—	—	—	6	—	—	—	—	—	1	—	—	—	—	—	1	—	—	—	20
40	61	Клімавіцкі	—	—	17	1	—	—	—	1	1	—	—	—	—	—	5	1	—	—	3	2	—	—	—	—	32
41	55	Клічаўскі	—	—	—	—	—	—	—	3	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	4
42	41	Койданаўскі	—	—	5	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	1	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	6
